Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністрації: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго хто яе прысылае. Можна також падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей,, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. | 1 Мая 1914 г. | № 17

## Дарэмная праца!

Роўна сорак гадоў — ад 1865 да 1905 г.—друкаваць беларускіх кніжэк не дазвалялі.

У часі «свабод» забарону змянілі, пачалі друкавацца газэты, кніжкі для народу. І вось ужо ў 1906 гаду першая беларуская газэта «Наша Доля» павінна была зачыніцца, бо с 6 выпушчэных нумэроў 5 паліція конфіскавала, за адзін рэдакція заплаціла колькі сот рублёў штрафу, ды рэдактара засудзілі на год у крэпасць.

Пад той час пачала выхадзіць і «Наша Ніва». І ўраз жэ, як бач, пасыпаліся цыркуляры: да вучыцелёў народных, да валасьцей, да бацюшэк, каб не пускалі газэты ў вёску, каб і самі яе не выпісывалі.

Па мястэчках, па вёсках паліція без ніякай прычыны адбірала кніжкі беларускіе, хаця ў іх было напісана, як вырабляць зямлю і садзіць бульбу. Гэтак ішчэ нідаўна прылучылася на сельска-гаспадарскай выстаўцы ў Лепэлі, ды ў іншых месцох...

«Беларусоў німа!» — гаманілі Кавалюкі, Солоневічы і іншые чорнасоценцы, даводзячы, што ў нашай староцны жывуць адны толькі «істінно-рускіе людзі».

«Беларусоў німа!» — гэтак сама абвесьціў міністр народнай прасьветы, Кассо, і выдаў цыркуляр, каб дзяцей беларускіх вучылі бы веры у школах у іх «роднай» **расейскай мові,** недапускаючы беларускай.

Вучыць чаго-колечы у школі па беларуску, тлумачыць дзецям аб невядомых рэчах у тэй мові, якую яны змалку чулі,—зусім забаронена.

І гэтак далей... Беларускую мову выгналі зусюль Нідзе німа для яе прыпынку,—адно толькі ў сэрцах шчырых сыноў Беларусі.

І вось, ня гледзячы на ўсе прашкоды, зерняты націонольнай сьведамасьці кінутые ў душу народную узышлі і закрасавалі пекнымі краскамі. Гэтые краскі—творы нашых песьняроў-паэтоў, думкі—ідэі беларускіх пісьменнікоў, беларуская кніжка і газэта, у сотнях тысяч разышоўшыеся праз дзевяць гадоў свабоды друку на Беларусі; гэта—беларускіе культурные і экономічные організації і таварыствы, беларускі тэатр і т. д.

Шмат перэмянілося ў нашай староцны ад 1905 году. Цяпер ня ўсюды пазнаеш, што тут быў самы цёмны, самы забіты кут. Замест імені «тутэйшаго» селянін наш знайшоў свае праўдзівае адвечнае імя: **беларус.**

Жыве Беларусь, жывуць беларусы І тые, хто думаў, бытцым адно слово: «німа!»—можэ запраўды звясьці беларусоў са сьвету, ўбачылі, што яны не дагледзілі вялікай перамены ў народзі. Ўбачылі і прызналі: старых способоў змаганьня з беларушчынай мала; трэба знайсьці новые.

Апошнімі днямі ў Пецярбурзі адбываліся нарады прэдстаўнікоў розных міністэрств разам з губэрнатарамі з беларускіх губэрній. На гэтых нарадах і займаліся тым, каб выкаваць новае аружжэ дзеля змаганьня з беларусамі. І чорнасоценны «Дым Отечества», паведамляючы аб гэтым, ужо напярод цешыцца...

Німа чаго, паночкі! Ні польскае, ні расейскае панаваньне не здалело звясьці беларусоў у той час, калі народ ешчэ спаў. Не звядуць іх і цяпер: беларусы збудзіліся ад доўгаго сну! Вялікая—чуць што не дзесяцімільённая грамада народу — узварушылася, скранулася з мейсца і цьвёрдым крокам ступае ўпярод да лепшай будучыны, да шчасьця і долі. і ніщто — ніякая сіла — не здалее палвжыць ізноў у магілу ажыўшы народ наш, ніхто не павернець кола гісторыі назад!

**а—н—а.**

## Бюджэт на 1914 г.

Гас. Дума прыступае ужо да прагляду бюджэту на 1914 год; гэта значэ рэестру усіх даходоў і расходоў казны, у каторым паказана аткуль і с каго казна бярэ грошы і што з імі робіць. Казна аблічае, што усяго даходу будзе сёлета мець 3.558.200.000 рублёў. Па вэдле катэгорый гасударственны даход дзеліцца гэтак. Падаткі за зямлю і «прамые» налогі — 264.500.000 руб.; акцызы («косвенные» налогі) на цукер, карасіну, табаку і інш. 709.200,000 руб,; даход ад прадажы гарэлкі 935,800,000 руб.; пошліны—232.400.000 р; гасударственные рэгаліі—133.600.000 руб. Даход з належачых да казны зямель, лясоў, двароў, фабрык, капіталоў 111.800.000 руб.; другіе розные даходы 147.000.000 р.

Надта многа даходу мае казна з гарэлкі. Гэта атрута прыносіць болей ¼ часці усяго даходу гасударства Далей, вялікі даход прыносюць акцызы на найболей патрэбные у жыцьці рэчы, без каторых найбяднейшаму чэлавеку німа як абыйсціся. Каб акцызы былі меншые — усё каштавалобы таней. Другіх падаткоў так сама шмат набіраецца. Аблічэна, што на кожнаго чэлавека у Расеі, сёлета прыдзецца уселякіх падаткоў і акцызоў 12 р. 24 кап. Гэтак выходзіць, што с сярэдняй селянскай сямьі у 5 чэлавек, бярэцца—61 руб. 20 кап. Пры нашай горкай беднасці гэта вялікіе грошы.

Расходуюцца грошы гэтак. На міністэрства Імператарскаго Двара 16.300.000 руб.; на высшые урадовые установы 8.600.000 руб.; на свяцейшы Сынод—52.900.000 р.; на міністэрство Ўнутрэнных Спраў—206.800.000 р.; М—во Народнай Асьветы 161.600.000 р.; М—во фінансоў 494.500.000 р.; М—во Заграпічных спраў—7.700.000 р.; Міністэрство дарог — 739.900.000 р.; Глаўнае Упраўленьне Землеустройства і Сельскай Гаспадаркі—157.600.000 р; Гл. Упр. Гас. Канязодства 4.600.000 р.; Ваеннае Міністэрства 599.100.000 р.; Марское Міністэрства 250.400.000 р; Гаспадарскіе патрэбы Ваен. Міністэрства — 125.400.000 р; Будоўля новых портоў 18.000.000 р.; Расходы на пакрыцьце коштоў японскай вайны 400.000 р.; Працэнты за гасударственные даўгі 402.800.000 руб; Розныэ расходы 133.400.000 рублёў.

Шмат сабралося гасударственнаго доўгу, калі адных працэнтоў што год трэба плаціць ажно 402.800.000 руб. На народную асьвету, гэту адну з найбольшых патрэб, выдаецца лішне мала, калі прыраўняць да другіх расходоў.

**Лявон Гмырак.**

## Зязюлька.

(*Народная казка*).

У Сцешкі быў сын Якуб, а у Мурашкі дачка Алена. Жылі яны у аднэй вёсцы над возерам. Алена на пяць гадоў маладзей была за Якуба; яны змалку жылі дужа дружна: дзе адно, там і другое; куды б бацька ні паслаў адно, глядзіш, а другое ужо бяжыць сустрэчаць першаго, і якая б беда ні здарылося з адным, будзе тужыць і другое. Бывала, здарыцца Якубу паехаць у горад, Алена цэлы дзень будзе ташнаваць, пакуль ня ўвідзіць свайго Якубку. Чым болі яны падрасталі, тым мацней любілі адно другога.

Старыкі глядзелі на сваіх дзяцей і радаваліся, што яны расьлі такімі паслухмянымі ды працавітымі.

Калі Якубу прайшоў 22 год, а Алене 17—зрабілі заручыны і назначылі вясельле цераз тры тыдні.

Ведама за працай і клапотай і ня відзелі, як прайшлі гэты тры тыдні. Якубу з Аленай спаткаўшыся некалі было і пагаманіць.

За тры дні да вясельля Якуб сабраўся ехаць прасіць у госьці; для гэтаго яму трэба было праехаць праз возера мілі са тры. Прапушчаць яго выйшла і Алена, і так неяк дужа жаласна глядзела на яго, што таму ажно маркотна стала; Якуб ня вытрываў і абнімаючы стаў унімаць яе: «Што с табой, Аленка мая, зязюлька ненаглядная, чаго ты так баішся?

— Ня ведаю, Якубка мой, што са мной робіцца, але здаецца, што я астатні раз віджу цябе; сэрцэ маё дужа баліць, а яно вяшчун і нядобрае чакаіць. Глядзі, Якубка, аб'ежджай тое мейсца. дзе вада у возеры круціцца. Барані Бог чаго?!

— Ня бойся, птушачка мая, мне ж ня першый раз ездзіць. І крэпка пацалаваўшы яе ён ускочыў у човен і шпарка паплыў.

Якубу нада было вярнуцца гэты-ж дзень, але прайшла ноч і паўдня другога дня, а ён ні вярнуўся; тады бацька яго, сеўшы у дубіцу, паехаў у тую вёску, куды ездзіў Якуб, папытацца, ці быў ён там. Усе дзівіліся, дзе мог прапасць Якуб, бо ён быў у іх, запрасіў на вясельле, а змеркаючыся паехаў да хаты.

Грамадой пусціліся шукаць, усё возера абшукалі, але ні чаўна ні Якуба не знайшлі. Тады усе згадзіліся, што яго закруціла вадой; бо ў адным мейсцы на возеры с прадвеку вада круціцца як у амуце і уцягаваіць на дно усё, што пападзецца.

Алена свая не сваей была; яна не плакала, але не спала і ня ела трэцій дзень, хадзіла каля возера, прыгледалася у ваду і усё звала: Якуб! Якубка мой залатый, адазвіся! Дзе ты?!

Ніхто, апрыч адгалоску з лесу, не адзываўся.

У нядзелю, калі маніліся вясельле згуляць, Алена і кажыць унімаўшым яе дзеўчатам:

— Дзеванькі, што я зрабіла худога, што мяне так пакараў Бог? Лепі-б мяне мамка у начоўцы закупаўшы была, чым так жыць. Не, няпраўда, Бог не справядлівы!

— Учуў гэту жальбу Бог! — разгневаўся і сказаў:

— За тое, што ты жалішся на волю Боску, дык будзь ты зязюлькай і да сканчэньня сьвету заві свайго Якуба.

Алена абярнулася зязюлькай і ўсё завець Я—куб! Я—куб! Якуб! і будзе зваць да сканчэньня веку.

**Л. Гвозд.**

## У КУЗЬНІ.

Я кузьню дужа паважаю. Ідучы каля кузьні заўсягды скажу кавалю «памажы Божэ»— і прыдумаю які інтэрэс, мінуцін хоць на пяток, зайсціся у кузьню.

Асабліва з вялікай пашанай аднушуся я ра Г—скай кузьні.

Чаму так? — можэ хто запытае.

— А таму, што, як я радзіўся, узгадаваўся і за дзеўчатамі бегаць пачаў—у гэтай кузьні жыў усё адзін і той жэ каваль—стары Бэрнусь.

Дзякуючы гэтаму Бернасю Г—ская кузьня уславілася на усю аколіцу, — бо Бэрнусь быў ня тое што каб, так сабе, проста Бэрнусь, ці як, прымерна мы грэшные людзі!.. Не!.. Бэрнусь быў такі чэлавек, які трапляецца на зямлі хіба можэ адзін толькі раз у тысячу гадоў...

Калі Бог пусьціў Бэрнуся на сьвет і паглядзеў на яго, дык і сам мусібыць падзівіўся свайму стварэньню.

Бэрнусь апроч таго, што быў Бэрнусь— ўладаў ешчэ і ўсімі талентамі разам. На каваля ніхто так не пахадзіў, як ён. І хадзіў ён ракам, і акуляры на насе, і хвартух на брусі

## 10 летні юбілей літоускаго друку

Сёлета уся Літва сьвяткуе 10 летнюю гадаўшчыну легалізацыі літоўскаго друку у Расеі. Друкаваць па літоўску кніжкі было забаронена у 1865 гаду і ад гэтаго часу да 24 красавіка 1904 году у Расеі не было надрукавана ніводнай кніжкі па літоўску лацінскімі літэрамі.

Лацінскіе літэры адыгралі відную ролю у разбуджэньні літоўскай нацыональнай сьвядомасці. Як вядома, Літвіны прынялі хрысціянства праз Польшчу, а разам с хрысціянствам, заходняго рымскаго звычаю,—праз тую-ж Польшчу,—прынялі і лацінскіе літэры у набожных і касцельных кніжках. Да 1865 году у літоўскай мове не было блізка ніякіх кніжэк сьвецкаго зместу:—былі толькі кніжкі духоўные, друкаваные па літоўску лацінскімі, а раней,—так як і у палякоў,—готыцкімі літэрамі. У 1865 гаду, пасьля польскаго паўстаньня, атпушчэно было с казны, дзеля абрусеньне літвіноў, 200,000 р. на друкаваньне літоўскіх кніжэк рускімі літэрамі. З гэтаго капіталу выдана было усяго толькі 40,000 р. на друкаваньне катэхізмоў і малітвеннікоў літоўскіх рускімі літэрамі, а рэшта капіталу, асталося ня выкарыстаным. Малітвеннікі, катэхізмы раздаваліся дарма дзецям па школах і ўсім, хто хацеў,—але забарона выклікала у літоўскім народзе нацыональную сьвядомасць і ён пачаў сам, як умеў бараніцца. Раздаваные дарма «новые» літоўскіе кніжкі селяне палілі і дзецям забаранялі прынасіць іх дамоў. Старые літоўскіе кнігі, друкаваные лацінскімі літэрамі, хаваліся па хатах, як скарб, бо паліцыя адбірала іх,—і праз гэта набіралі яны цаны у вачах літоўскаго селяніна і было што раз болей людзей, каторые хацелі мець забароненые «свае літоўскіе малітвеннікі». За колькі гадоў пасьля забароны у тэй часьці Літвы, што пад Прусіей, у гор. Тыльжы, пачалі друкаваць літоўскіе малітвеннікі і іншые кніжкі для расайскай Літвы. Друкарскіе машыны выкідалі дзесяткі тысяч літоўскіх кніжэк у Прусіі і кніжкі гэтые, контрабандай, расходзіліся па ўсей расейскай Літве. Каля 1900 году не было хаты у Літве, дзе не было-бы літоўскаго забароненаго малітвеніка. Бывалі здарэньня, што паліцыя перэнімала на дарозі у касьцёл людзей, перэтрасала іх і атбірала «нелегальные малітвеннікі», бывала, што і абступала касьцёл і на сьвентары адбірала. У канцы стала ясна і правіцельству, што забароны тут не памогуць, бо заграніцай с кожным годам множыліся друкі і часопісі, і расходзіліся шырока па ўсей Літве. І вось за год перэд абвешчэньнем маніфэсту аб свабодах, была знята забарона з літоўскіх друкоў. Літвінам было пазволена друкаваць, якімі самі яны захочуць літэрамі

Такім парадкам сёлетняя гадаўшчына дозвалу на лацінскіе літэры у літоўскіх друках, яўляецца разам і 50 летняй гадаўшчынай змаганьня за гэты друк і за адраджэньня Літвы.

За апошніх дзесяць гадоў літвіны у Расеі здалелі выдаць каля 5 мільёноў экзэмпляроў кніжэк і сарганізаваць больш 25 газэт. Апрача гэтаго забанона літоўскаго друку прымусіла літвіноў вучыцца граматы пакрыёму, па хатах і цяпер па граматнасьці ковенская губэрня займае першае мейсцо у Расеі.

Сёлетняя 10-ці летняя гадаўшчына, гэта вялікае сьвята літоўскаго народу, агляд пройдзенаго, і гэты агляд запраўды можэ вяселіць душу кожнаго чэлавека, а цагатоў таго, людзей каторые самі па цэгліне кідалі на гэты гмах. І гмах зарысаваўся вялікі, стройны і дадае веры ды сілы працаваць далей.

Мы, беларусы, ад усей душы, у 10 летнюю гадаўшчыну літоўскаго друку віншуем нашых суседзёў жычучы ім і далей развівацца і будаваць будучыну сваей бацькоўшчыны Літвы. Хай развіваецца і красуе Літоўскі народ, яго літэратура і штукарство.

**Власт.**

## Крыху з гісторыі пьянства.

Час усё зменяе. Час зьмяніў і пагляд людзей на гарэлку. Калісь, за паншчыны, народ прывучалі каб ён як можна болей выпіваў гарэлкі і, дзеля гэтаго, бывалі двары у каторых падданые павінны былі выпіваць усю гарэлку, што выгоніць дворны бровар.

Народ мала-памалу уцягіваўся у гарэлку, распіваўся, і даваў даход—«карысць» двару і тады гэта лічылося добрым... Але не надоўга.

Некалі нехта прыраўняў гарэлку да пугі: калі у ездака у руках пуга—конь шпарчэй бяжыць, але толькі пакуль конь сыт. Як знедужэе з голаду, не памагае пуга. Гэтак і гарэлка: сперша выціскала с падданаго добры даход, але пачэкаўшы народ уцягнуўся у гарэлку, абяднеў, знехлемяжэў; стаўся тым галодным канём, катораму ужо пуга не памагае.

Тады пачалі думаць як ізноў паставіць на ногі селяніна, гэтаго адвечнаго плацельшчыка падаткоў.

Думалі доўга. Пробавалі розных спосабоў: пужалі пеклам, страшылі чортам і... што раз болей аткрывалі корчэм.

Пьянство расло і не было на яго зводу.

«Капшчына»—хмельны даход—сталася ласым куском і да яго прысябравалося духавенство і скарб.

«На тры сялы прыходзілося па 10 корчэм і ніводнай школы»... Кажэ адзін краёвы гісторык XVIII сталецьця.

Што раз шырэй пачыналі гаварыць аб шкодзе гарэлкі. Гаварылі многа, стагналі, ўздыхалі і што раз болей аткрывалі бравароў па дварах, дварках, манастырах і засьценках.

Праўда! жылі тады паны шырока,
Было-ж зачым надуцца ім:
Жывот быў сыт і сыта вока
І не збывала ім ні ў чым...

(Хвэлька з Рукшэніц: «*Саусім ня тое што было*».

А як жыў народ? Як жыў?! Каму-ж тады гэта на вуме было? Праўда лепшые людзі і тады і раней, з абурэньнем вытыкалі луцежство народу, але тые, катораым гэта вытыкалося мелі шчыльна заткнёные вушы і сэрцы. Аб народзе некалі было думаць... Даволі было сваіх клопатоў...

. . . . . . . .

Пасьля насталі іншые паны... Бурачкоў селянін не патрапіў палічыць іх на пальцах... Гарэлка здаражэла бо налажылі акцызу «каб меней пілі». Але селянін мае цьвёрдую натуру: раз уцягнуўся—не ўступае.

...Пазволілі прыгаварамі закрываць панскіе корчмы. Карчмары ставілі 2—3—5, а ў патрэбі і 20 вёдзер гарэлкі і селяне падпісывалі прыгавар што: «без карчмы німа як жыць». Але ўсё-ж такі корчмы закрываліся, даход з гарэлкі меншаў...

...«Каб зьвясьці пьянство» завялі манапалькі. Скасавалі «жыдоўскіе» корчмы, каб селяне не заседжываліся за гарэлкай...

Настаў час «астраноміі». На вуліцах гарадоў, гарадкоў, мястэчак і пры трактавых дарогах можна было бачыць «любіцелёў астраноміі», каторые пад голым небам праз «паскудніка», «кручок» і «саракоўку» сачылі на небі зоры.

Усе у адзін голас сказалі.

— Непрыстойна!

А тым часам чорт не спаў...

І заместа — «што сяло—карчма» сталася кожная удовіна і ня ўдовіна хата карчмой.

Ужо ня тое, што даўней: ня жонка мужа, акладаючы чэпялой дамоў за валасы валакла, а прыстойна, у сваей хаці, мужык жонку укладаў пьяную спаць і дзеткі па кутках, заплетаючымся языком, шэпетлявючы, вясёла падпевалі непрыстойные песьні, што салдат Рыгор пяе, як прыходзіць да мамы «у госці».

Даходы акцызнаго ведамства расьлі...

Ажно 10 жніўня 1913 г. цыркулярам пастаноўлена было: дзе селяне пастановюць прыгаварам, закрываць манапалькі! Бо лішне развялося пьянство.

Цяпер чарод прыйшоў сядзельцам стаўляць гарэлку сходу, каб сход пісаў прыгавар што «без манапалькі нам німа як абыйсьціся».

Аднаго паночка пужаў акцызнік:

---

насіў і табаку у цэркві нюхаў... Бог не ашукаўся, што — як толькі сатварыў Бэрнуся — адразу даў яму у рукі і малаток, і клешчы, і табакерку...

А які быў лгун, які прайдак і звадыяш—дык мусіць другі такі у сьвецці ці знашоўся-б...

А знаў і ведаў, дык рашытэльна ўсё, чаго нават можэ і ніхто ня ведаў.

Бэрнусь знаў — як што на вямлі, і як на небі, — на чым неба дзержыцца, і на чым земля тарчыць; с чаго што пачалося, і на чым кончыцца.. І калі вайна, і калі мір і калі якая пагода будзе — умеў угадаць ня горш ўсякаго Бруса.

Калі Бэрнусь ужо сусім састарэў, і яму зрабілося выгадней абапёршыся рукамі аб кавадла ракам стаяць, як малатком махаць, дык ён мала за кавальскае дзела і браўся... Укіне зялеза у гарон бывала, але яно сабе там тады і скварыся, а ён як пачнець ілгаць, ды разам і праўду казаць, дык ня толькі што людзі, а навіт кавальскі мех перэстае сапець і слухае...

Раскажэ ён бывала, як у яго быў дзядзька, што трохпудовае тачыла цераз кузьню перакідываў. Раскажэ, як каля Дрыгуч у сасоніку, на высокім пагурку калісь то стаялі пакоі, а пасьля гэтые пакоі разам с паненкай скрозь зямлі праваліліся.—Як на першы дзень Вялікадня, у часе заутрэні, пагурак гэны расчыняецца, і тады можна увідзіць паненку, каторая плачэ, просіць і жджэць каб хто зьняў з яе пракляцьця і вызваліў с пад'зямельля, — а гэта зробіць толькі той, хто угадае, як імя тэй паненкі... Раскажэ — як былі даўней «ізавіты» і чэрнакніжнікі, як яны пад'зямельные лёхі капалі і з нячыстай сілай зналіся... Раскажэ — як с пятуховаго яйца высядзець і выгадаваць зьмея, каторы грошы носіць. Раскажэ — дзе і колькі грошы схавана,—раскажэ — калі і як трэба рабіць шчуп, і сколькі і якіх на наклад нада іголак, каб гэты шчуп вярней паказываў, дзе капаць грошы... Раскажэ—калі. ад каго і як народзіцца «анцыпар», — як ён будзе людзей абманываць, — як кончыцца сьвет, — як перэгарыць земля; як тады пойдуць другіе людзі, каторые у дзесяці будуць петуха калоць і на петухах пахаць будуць... Ды дзе там усё і спамятаеш, што ён бывало расказываў. І хоць рабіць Бэрнусь зусім мала чаго рабіў, але дзеля таго народу у кузьні было як бітком набіта і кузьня была у славе.

Цяпер Бэрнусь памёр, рай яму сьветлы, і яго мейсца у кузьні заступіў сын яго Кароль, — але людзі на гэту кузьню не забываюцца. Праўда, Кароль не так лёгак на язык, як бацька. Але тон у кузьні вядзецца той жэ, што і пры бацьку. Знашліся людзі, каторые—хоць і не раўня Бэрнусю — але ва ўсім яго пасачылі, ва ўсім знялі з яго форму. Трапіцца у кузьню Рыгор Пагашчанскі, або Янка Лаўручонак, ці ешчэ там хто, дык яны цябе і насьмешаць, і да злосьці давядуць і многа чаго цікавага набаюць...

Быў я анэгды у кузьні. Народу было шмат, але на гэты раз было не да жартаў, не да кепства, бы досыць было гутаркі аб важных і цікавых рэчах. Як я прышоў гукалі аб грашавых справах. Кароль штурнуў папіросіну у гарон, паправіў на брусі хвартух, аткашляўся, плюнуў, скрэбануў нагой і расказаў, як брат прыслаў яму с Пецярбурга 10 рублёў, і як нехта замест яго гэные грошы с почты зьняў і яму «дзякуй» не сказаў... Кавальскі мех пры гэтым настроіў грозную міну і сярдзіта засапеў. Невядома, што далі выйшло-б, але на гэту пару, у кузьню ускочыў дзяк.

—Памажы Божэ!

— Дзякуй!..

— А вы ўсё пра грошы?

— І пра грошы, і аб усім па троху.

— А гэта ці чулі? — міністр у атстаўцы, Кокоўцоў, бярэ ужо 24 тысячы рублёў пэнсіі... Добрые грошы?..

— ?!!!..

Пачалі лічыць і далічыліся, што Навіцкоўскі вясковы учыцель, каб атрымаць такіе грошы павінен служыць... 200 гадоў!.. А салдат Янка, што бярэ за турэцкіе раны па 90 рублёў у год, да 24-х тысяч ді дабярэцца навіт ешчэ цераз 230 гадоў.

Зайшоўся нейкі падарожны і расказаў, што ён езьдзіў у Дзісну, каб узяць грошы, каторые ён палажыў, як браў сына да суда на парукі.

«Палажыць, казаў ён,—было дужа лёгка, а назад узяць—ані з якога боку...

— З грашмі усё не ладна! — атазваўся Рыгор Пачашчанскі.

— Каля Валынцоў (Віт. губ. Дрыс. пав.), кажуць, зборшчык казённых грошы па «вінапольках», перэбіраўся цераз Дрысенку. Лёд перэламіўся... Пара коні шухнулі у ваду. Хурман кінуўся ратаваць коні, а зборшчык сядзеў у вазку і спалохаўшыся ня ведаў што рабіць. — Коні сталі тапіцца і пацягнулі за сабой і вазок са зборшчыкам. Зборшчык абмачыўся, але дзякаваць Богу, выкарабкаўся на крыгу... толькі сумачка... адарвалася... і—утапілася... Рыгор бажыўся, што сваімі вачамі відзеў, што рэмяшочак, на якім вісела сумач-

выпісываць і чытаць польскіх газэт. Відаць з гэтаго, што сын ідэйнаго бацькі, не канечне мае быць, не скажу ужо ідэйным, але на агул справядлівым у грамадзянскім жыцьці чалавекам. Этыка (справядлівасць) грамадзянская пана В. Ч. як з гэтаго відаць адолела усяго толькі дарасьці да этыкі дзікуна, каторы мяркуе так, што калі ён сам зьеў суседаву жонку — то гэта добра, але калі сусед злавіў і сьцёк на сьнеданьне яго жонку, то гэта блага.

Наагул у нашай ваколіцы чуваць не мала нападак на беларускі рух, асабліва са стараны чыновенства, духавенства (грэцкаго і рымскаго «звычаю») і паноў. Пры гэтым цікава, што нападкі заўзвычай ідуць у разрэз адны проці другіх. Расейцы даводзяць у такіх нападках, што беларускі рух, гэта «ополячиваніе», бытцым адвечных русакоў-маскоўцоў, а палякі даводзяць, што беларускі рух—гэта абрусеньне.

*Чытач і прыхільнік.*

**Пажар.**

Гэтымі днямі у Дзісьне згарэло больш 40 дамоў і гаспадарскіх будынкоў, у тым ліку і вышэйшая пачатковая школа. Страт больш як 35 тысяч руб.

## З Міншчыны.

**Змаганьне с пьянствам.**

Як вядома 10 жніўня 1913 году міністр грашавых спраў цыркулярам, загадаў закрываць усю ды манапольки, дзе толькі селяне гэта пастановюць прыгаварам. Карыстаючы з гэтаго пазваленьня у Мінскай губэрні па ўсіх сёлах пачалі селяне змагацца с пьянствам. У розных мястэчках і валасьцях робюць прыгавары аб закрываньню манаполяк, піўных і рэстараноў. Гэтак, гэтымі днямі у Ігуменскім павеці, селяне мястэчка Узляны і вёсак Драчкоўкі і Ячэнкі на сходах разглядалі способы змаганьня с пьянствам. У адзін голас пастанавілі пазакрываць у сябе усе манапольки, піўные і рэстараны. Драчкоўская грамада пастанавіла апрача таго звярнуць асаблівую увагу на змаганьне с патайным шынкарствам, а Ячэнская грамада пастанавіла старацца каб былі пазакрываны розные шынкі, ня толькі у Ячэнцы, але і ў іншых мейсцох гэтай аколіцы. Паветовы камітэт цьверозасьці, прылучыўшыся да пастаноў грамад, пастанавіў пазакрываць без аткладу у гэтых сёлах усе шынкі.

Што дня па ўсей губэрні складаюцца новые і новые прыгавары аб закрываньні шынкоў. Здаецца, вот, народ лягчэй адатхнуў, зварухнуўся і пасьпешае бараніцца ад найбольшаго зла, якое дагэтуль разьедало вёску.

З наступленьнем вясны пайшоў гуляць, як што году, чырвоны пятух па нашых вёсках, мястэчках і гарадкох. За апошні тыдзень, адмечэных у газэтах было шмат пажароў, а не адмечэных ешчэ болей. І гэтак згарэло мястэчка Лагойск—8 дамоў, с халодными будоўлямі, рабёнак і карова. Згарэла вёска малая Волхва Новагрудз. пав.—усе хаты і халодные будынкі; пагарэла усё да шчэнту. У вёсцы Угальцы, Мозырск. пав., згарэло 15 хат. У Старых Дарогах згарэла пільня — страт на 60,000 руб. У Пінску згарэла пільня — страт на 39,000 руб.

А вясковых пажарных дружын так як і няма! *Сваяк.*

**Недашоўшы прыгавар.**

У вёсцы Кленік, Ігуменск. пав. Вехнянск. вол. селяне хацелі закрыць манапольку, але сперша нешта пісар круціў, а калі селяне пажаліліся земскаму і той загадаў пісару склікаць сход аб закрыцьці манапольки, то і так не удалося закрыць, бо сядзелец, як кажуць, не пашкадаваў двух вёдзер гарэлкі і, праўда добра падхмеленые некаторые Кленіцкіе і Забалоцкіе селяне крычэлі, што манаполька у Кленіках надта патрэбна. На Вялікдзень у нас манаполька хоць і была зачынена, але гарэлкі можна было купіць колькі каму хацелося Кажуць людзі што прадаваў гарэлку..—ды ніхай сабе,— адным словам на Вялікдзень было ня менш пьянства, ян і у звычайны таргові дзень па другіх мястэчках. *В. Русы.*

## З Могілёўшчыны.

У нашай Могілёўшчыне веснакрасна пачала прынасіць звычайные навіны нашай вясны і лета—пажары. Што год у губэрні згарае на мільёны рублёў людзкога дабра і працы. Дагэтуль былі такіе пажары: у мястэчку Копысі згарэло 90 дамоў і 75 крам. Мястэчко загарэло ад падпалу — вінаватаго арэштавалі і ён прызнаўся. У сяле Польковічах пагарэло 17 гаспадароў; у агні спяклося трое дзетак.

# З усіх старон.

**Забастоўкі.**

С прычыны апошніх здарэньнёў у Гас. Думе у Пецярбурзі сярод работнікоў шыруцца забастоўкі і неспакойствы. 25 красавіка баставало назнак пратэсту, проці агранічэньня у правах Гас. Думы, 25,000 работнікоў. Фабрыканты закрылі цэлы рад фабрык. Больш 10.000 работнікаў асталося без работы.

У Маскве на знак пратэсту баставало 23 фабрычные установы—усяго больш 10,000 работнікоў.

**Перамены у міністэрстві.**

У Думскіх кругах шыруцца чуткі, што незабавам будуць вялікіе змены у Міністэрстві. Бытцымто пойдуць у адстаўку міністры—Кассо, Маклаков і Шчэгловітов.

**Дзень работніцкай прэссы.**

У Пецярбурзі работнікі устроілі «дзень работніцкай прэссы» (друкоў). Дзень прайшоў бойка. Сабралі на работніцкую прэсу каля 100.000 рублёў. Адміністрацыя прылажыла усе старанья, каб у гэты дзень не збіралося ніякіх складак. Былі массовые рэвізіі і арэшты. Гэтак сама удаўся у Пецярбурзе і работнікі «дзень цьверозасьці». Рэстараны і тракціры таргавалі у гэты дзень дрэнна. Адбылося у гэты дзень многа сабраньнёў з рэзолюціямі проці пьянства.

**Забарона народным вучыцелям.**

Міністр асьветы Кассо забараніў цыркулярам народным вучыцелям належаць да мейсцовых грамадзянскіх арганізацій: таварыств цьверозасьці, сельска-гаспадарскіх суполак, малочных хаўрусоў і інш. падобных організацій.

**Забарона сьвяшчэннікам.**

Сынод забараніў сьвяшчэнікам і дзяканам паступаць у універсытэты і іншые вышэйшые школы, паясьняючы, што навука у гэтых школах не пасуе для духоўных асоб.

## Шарада № 5.

Вазьмі два склады,
Каб добры былі да яды,—
Прыбаў да іх і склад трэці,
Будзе птушка, умее пеці.

*Л.*

**Разгадка шарады № 4:**

Маг—да—ле—на. Прыслалі разгадку: Ліхтаровіч, І. Фарботко, А. Z., (вершам), К. Маркеліс, Ануфры Давідоўскі, А. Гончарык, Б. Сьвідэрская, А. Петрашкевіч (вершам).

## Пачтовая скрынка.

**Елен—му.** У віленскі вучыцельскі інстытут каталікоў беларусоў не прыймаюць. Колькі гадоў таму назад вучылося у інстытуце двое каталікоў—літвіноў, але іх быў прыняўшы быўшы папечыцель вучэбнаго округа, на сваю рызыку. У законе нічога не сказана аб тым—можна ці ня можна прыймаць у інстытут каталікоў беларусоў і літвіноў, але,—с праграмы «Закону Божаго» відаць, што праграма служыць толькі для праваслаўных».--Калі-ж цяпер прасіць у міністэрства раз'ясьненьня, то атказу можна дачэкацца дужа ня скора, бо такое раз'ясьненьня раўняецца установе новаго закону.

## Жарты.

* * *

Кум да кумы кажэ:
— Дзякуй табе, кумачка, што ты мне хлеб замясіла.
— І табе, кумок, дзякуй, бо пры здарэньні, я хоць раз сабе рукі добра абмыла.

* * *

Вучыцельніца да вучня:
— Калі бывае самы доўгі дзень?
— Як бацька прапье усе грошы і незашта купіць хлеба.

*Аўч—коў.*

**Пры гэтым нумары разсылаецца цэннік гаспадарскіх машын ЗЫГМУНТА НАГРОДЗКАГО.**

Рэдактар І Луцэвіч.
Выдавец А. Уласоў.

Знаменітые швэдзкіе цэнтрафугі
„ДІАБОЛО“
а такжэ масляркі, ціскачы, жбаны да малака, студзеннікі, цадзілкі, фільтры, фарба да масла і уселякіх малачарскіх прылад вялікі выбор
Суліць Зыгмунт Нагродзкі
Вільня, Завальная вуліца № 11.
Цэннікі на жаданьня высылаюцца адваротнай почтай.

Т-ва „Праваднік“
Віленскі аддзел
Вільня, Вялікая вул., д. гр. Тышкевіча № 96, тэлеф. 10—13.
» » » д. Сыркіна № 42, тэлефон № 18—08.
Коўна, Мікалаеўскі праспэкт дом № 15, тэлефон 1—87.

Галёшы навейшых фасонаў
Цацкі
Непрамакаючые плашчы
Падарожные рэчы
Чэмаданы
Картонкі
Порт-пледы
Сумкі і др.
Шчоткі і грэбяні
Помпадуры скураные вядомай фабрыкі Бэклі
Лінолеум найлепшая насцілка падлог для дач і кватэр.
Мячы с сеткамі
Футболы англікіе
Прыборы для тэніса
Шыны экіпажные, велясапэдные і аўтомобільные.
Усе тэхнічные і хірургічные гумілястыкавые і азбэтовые выробы.